цый і дасягненняў сучаснай навукі шукаў шляхі рашэння стратэгічных задач, якія стаяць перад чалавецтвам.

У выніковай працы «Універсум. Інфармацыя. Грамадства» навуковец фармулюе цэнтральную ідэю сваёй сацыяльна-філасофскай канцэпцыі: «Каля чвэрці стагоддзя таму назад, займаючыся вывучэннем біясферы як некаторай цэласці і яе ўзаемаадносінах з грамадствам, я прыйшоў да пераканання, што перспектывы развіцця чалавецтва звязаны не столькі з тэхнічным удасканаленнем яго цывілізацыі, колькі з кардынальнай зменай самой цывілізацыйнай парадыгмы, з перабудовай духоўнага свету чалавека, зменай яго шкалы каштоўнасцей. Чалавеку неабходна змяніць уяўленне аб сабе як аб "пераможцу" Прыроды на імкненне быць сужыцелем навакольнага свету, навучыцца забяспечваць сумесную эвалюцыю, сумеснае развіццё з Прыродай» [1, с. 12].

Працэс сумеснага, гарманічнага развіцця прыроды і яго складовай – грамадства – М.М. Майсееў вызначае як «казвалюцыю прыроды і грамадства». Пад казвалюцыяй прыроды і грамадства навуковец разумее такое развіццё грамадства як элемента біясферы, якое не парушае працэс развіцця самой біясферы як сістэмы.

Паняцце «казвалюцыя прыроды і грамадства» іграе ключавую ролю ў сацыяльна-філасофскай канцэпцыі М.М. Майсеева. Па яго словах, гэта паняцце зусім не простае. Яно патрабуе дбайнай і глыбокай расшыфроўкі, гэта значыць такой сістэмы даследаванняў, у выніку якіх будзе ўсталявана залежнасць характарыстык біясферы ад актыўнай дзейнасці чалавека. Ён лічыць, што толькі маючы дастаткова поўнае ўяўленне аб характары гэтай узаемасувязі, можна сфармуляваць тыя абмежаванні на дзейнасць чалавека, якія неабходны для забеспячэння яго будучыні.

Казвалюцыя прыроды і грамадства, лічыць філосаф, вызначаецца шматлікімі акалічнасцямі. Але сярод гэтага мноства ён вылучае два лёсавызначальныя для чалавецтва фактары. Першы – людзі павінны ведаць законы развіцця біясферы, ведаць магчымыя прычыны яе дэградацыі, ведаць, дзе тая фатальная рыса, якую чалавек не павінен пераступаць ні пры якіх акалічнасцях. Мяжу дапушчальнай актыўнасці чалавека, якую ён не мае права пераступаць ні пры якіх акалічнасцях, навуковец вызначае як «экалагічны імператыў». Такім чынам, па яго меркаванні, патрабуецца фарміраванне на базе натуральных навук такой сінтэтычнай навукі, якая была б здольная распрацаваць стратэгію ўзаемаадносін прыроды і чалавека, што накладае на дзейнасць грамадства ў цэлым і кожнага чалавека паасобку сістэму вельмі цвёрдых абмежаванняў – сістэму «абсалютных табу».

Іншая, не менш важная акалічнасць, без якой бессэнсоўна гаварыць аб забеспячэнні казвалюцыі прыроды і грамадства, лічыць М.М. Майсееў, заключаецца ў неабходнасці сцвярджэння на планеце такога грамадскага парадку, які быў бы здольны рэалізаваць гэту сістэму абмежаванняў. Гэта другая ўмова, па яго словах, адносіцца ўжо да галіны гуманітарных навук. Яе выкананне запатрабуе спецыяльных высілкаў грамадства і новай яго арганізацыі. Па меркаванні навукоўца, неабходна, каб грамадства было здольна не толькі рэгламентаваць свае дзеянні, але і стаць некаторай кіруючай падсістэмай біясферы, якая будзе накіроўваць развіццё грамадства так, каб яно садзейнічала і развіццю біясферы ў цэлым.

М.М. Майсееў лічыць, што вывучэнне праблем казвалюцыі прыроды і грамадства адкрывае новы і, магчыма, найважнейшы кірунак сучасных фундаментальных даследаванняў. Ён падкрэслівае, што калі XIX ст. было «стагоддзем пару», XX ст. – «стагоддзем электрычнасці і атамнай энергіі», XXI ст. будзе «стагоддзем гуманітарных ведаў». Навука аб забеспячэнні казвалюцыі прыроды і грамадства, па яго меркаванні, павінна стаць той сінтэтычнай дысцыплінай, якая павінна даць людзям веданне аб тым, што неабходна для працягу існавання чалавецтва на Зямлі і далейшага развіцця яго цывілізацыі.

На першым этапе свайго развіцця новая навука, па словах М.М. Майсеева, павінна насіць чыста прыкладны характар, паколькі гэта дысцыпліна зробіцца навуковай базай лёсавызначальных рашэнняў для чалавецтва. Праца па стварэнні такой дысцыпліны ўжо пачалася. Па яго меркаванні, яе натуральнай складовай з'яўляецца экалогія. Навуковец падкрэслівае, менавіта складовай, бо праблемы, якімі сёння займаецца экалогія, не ўключаюць у сябе шэрагу пытанняў, жыццёва важных для будучыні чалавецтва, у прыватнасці, даследаванне біясферы як цэласнай дынамічнай сістэмы.

Але, адзначае М.М. Майсееў, гэта толькі адзін з раздзелаў будучай навукі. Галоўнай складовай будучай навукі, лічыць ён, будуць гуманітарныя дысцыпліны, бо навуковая праграма распрацоўкі прынцыпаў казвалюцыі прыроды і грамадства, або канцэпцыі наасферагенэза, невымерна шырэй за тыя прыродазнаўчанавуковыя і эканамічныя праграмы, якімі займаюцца прафесійныя эколагі або эканамісты. Разам з тым, ён мяркуе, што распрацоўку навуковых асноў праблемы казвалюцыі прыроды і грамадства нельга адкладаць. Распрацоўка і яе рэалізацыя павінны ісці паралельна.

У цяперашні час вывучэнне неабходных умоў казвалюцыі прыроды і грамадства прасу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нулася ў цэлым шэрагу пэўных кірункаў. На многіх прыватных прыкладах ужо паказана вялізная стабілізуючая роля біёты ў цэлым і асобных экасістэм. М.М. Майсееў асабліва вылучае тэорыю біятычнай рэгуляцыі і стабілізацыі навакольнага асяроддзя В. Гаршкова, а таксама працы Н. Пячуркіна. Вывучэнне фізіка-хімічных асаблівасцей атмасферы дазволіла ўсталяваць уплыў фрэонаў на структуру азонавага пласта і прыняць Манрэальскі пратакол – найважнейшае рашэнне аб забароне выкарыстання хлор- і фторзмяшчальных ахаладжальнікаў і аб пераарыентацыі халадзільнай прамысловасці на іншы тып хладонаў. Разгорнутыя шырокія даследаванні магчымых наступстваў пацяплення клімату з-за павелічэння канцэнтрацыі вуглекіслаты і метану ў атмасферы што, па меркаванні М.М. Майсеева, прывядзе да новай сістэмы забарон, а па меры развіцця далейшых навуковых даследаванняў колькасць забарон непазбежна будзе расці. І іх прыйдзецца выконваць. Па яго словах, гэта стане самай цяжкай задачай, якая калі-небудзь паўставала перад чалавецтвам, паколькі сярод забарон з'явяцца і такія, што будуць рэгламентаваць рост народанасельніцтва і ўносіць новыя абмежаванні ў тое, што прынята зваць воляй асобы.

Стан біясферы і грамадства, у якім быў бы рэалізаваны прынцып іх каэвалюцыі, навуковец атаясамлівае з паняццем «эпоха наасферы». «Наасфера – гэты такі стан біясферы, калі яе развіццё адбываецца мэтанакіравана, калі Розум мае магчымасць накіроўваць развіццё біясферы ў інтарэсах чалавека, яго будучыні. Па гэтых прычынах я лічу больш дарэчным гаварыць не аб наасферы, а аб эпасе наасферы, калі чалавек ужо зможа разумна распараджацца сваёй магутнасцю і забяспечыць такія ўзаемаадносіны з навакольным асяроддзем, якія дазволяць развівацца і грамадству, і Прыродзе» [2, с. 24].

Для ўступлення чалавецтва ў эпоху наасферы, па словах М.М. Майсеева, яму давядзецца пераадолець вялізныя цяжкасці і, перш за ўсё, – пераадолець самога сябе. Чалавек жа не проста біялагічны від. Ён адрозніваецца ад усіх іншых жывых істот тым, што ў яго ёсць розум, рэакцыю якога на ўскладненне зямнога становішча сёння наўрад ці магчыма прагназаваць.

Тым не менш, уступленне чалавецтва ў эпоху наасферы, калі біясфера і грамадства будуць развівацца як адзіны арганізм, як кааператыўная сістэма, эвалюцыя якой імкнецца (але не гарантуе) забяспечыць гамеастаз чалавека і біясферы, М.М. Майсееву ўяўляецца, у прынцыпе, магчымым. «Але яно будзе азначаць якасную змену характару эвалюцыі грамадства і чалавека. І не толькі грамадства, але і біясферы як сістэмы. Гэта значыць, што тады паўстане яшчэ раз НОВАЯ ПЛАНЕТА! Гэта зусім не азначае, што зменіцца логіка Прыроды і яе законы, а толькі тое, што гісторыя людзей, вядзёная іх агульным розумам, будзе больш эфектыўна ўзгоднена з логікай Прыроды!» [3, с. 79].

Але калі прытрымлівацца агульных законаў універсальнага эвалюцыянізму, адзначае навуковец, чалавек на працягу працэсу антрапагенезу, у прыватнасці ў перыяд «неалітычнай рэвалюцыі», ужо нараджаў новую планету і сам станавіўся новым чалавекам, гэта значыць перабудоўваў асновы эвалюцыйнага працэсу і, перш за ўсё, самога сябе.

Што датычыцца ўмоў, дастатковых для забеспячэння гамеастазу сістэмы «біясфера – грамадства», то, па меркаванні М.М. Майсеева, іх нельга сфармуляваць і верагодней за ўсё іх проста не існуе. Біясфера змяняецца, у ёй, як і ў любой іншай сістэме, якая нелінейна і дынамічна развіваецца, пануе выпадковасць, і прадказаць на больш або менш працяглы перыяд яе развіцця прынцыпова немагчыма. Гэтак жа немагчыма прадказаць і здольнасць грамадства адаптавацца да магчымых змен. Прагностыка такога кшталту, лічыць М.М. Майсееў, ляжыць за межамі навуковага ведання. Магчымым, па яго словах, з'яўляецца даследаванне тэндэнцый развіцця і пабудовы шматварыянтных сцэнарыяў магчымых змен «агульнапланетарнага» становішча ў залежнасці ад актыўнасці чалавека.

М.М. Майсееў мяркуе, што пераход чалавецтва да эпохі наасферы не наканаваны, і людзі аднойчы могуць пераступіць (калі ўжо не пераступілі) мяжу дазволенага, за якой адбудзецца пераход біясферы ў такі новы стан, у якім чалавеку ўжо не будзе месца. Акрамя таго, чалавеку ўласцівы нейкія агульнабіялагічныя заганы, якія могуць перашкодзіць яму сканцэнтраваць «калектыўны розум» і «калектыўную волю» на забеспячэнні новага гамеастазу. Каб гэтага не здарылася, чалавецтва павінна знайсці сілы павярнуць кола сваёй гісторыі. Таму, па словах навукоўца, будучыня чалавецтва закладзена ў ім самім.

Такім чынам, у аснове тэорыі наасферагенезу павінен ляжаць «пошук стратэгіі пераходу да грамадства, здольнага забяспечваць умовы каэвалюцыі прыроды і чалавека, аснова якой – фарміраванне навукова абгрунтаваных дактрын (табу) і вельмі паступовы да іх пераход. Менавіта паступовы, бо грамадства не прыме хуткіх сацыяльных перабудоў у сілу свайго традыцыйнага светапогляду. А павінна адбыцца змена і таго, і іншага!» [3, с. 80].

Асаблівае месца ў кантэксце каэвалюцыі прыроды і грамадства і тэорыі наасферагенезу

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

М.М. Майсееў адводзіць фарміраванню сучаснага гуманізму або новых прынцыпаў маральнасці, якія павінны быць універсальнымі для ўсёй планеты, пры ўсім адрозненні цывілізацый народаў, якія яе насяляюць.

Сістэму поглядаў вучонага на будучае грамадскае развіццё можна звесці да двух асноўных палажэнняў. Паводле першага палажэння, грамадства ўступае ў такую эпоху, калі яго далейшае развіццё магчыма толькі ва ўмовах выканання «экалагічнага імператыву». Сучасная навука па меры свайго развіцця здольна ва ўсё большай ступені раскрываць яго змест і фармуляваць універсальную сістэму забарон, абавязковую для ўсяго чалавецтва.

Другое палажэнне звязана з выкананнем ўмоў «экалагічнага імператыву» і зводзіцца да «імператыву маральнага». Выкананне ўмоў экалагічнага імператыву будзе накладаць *дастаткова цвёрдыя абмежаванні* на характар актыўнай чалавечай дзейнасці і, такім чынам, будзе істотна змяняць існуючыя ўяўленні аб волі асобы. І толькі тады ўмовы выканання экалагічнага імператыву атрымаюць права на існаванне, калі яны будуць рэалізоўвацца цалкам свядома, у сілу ўнутранай неабходнасці, а не толькі на аснове Закона. «Па меры развіцця ведаў і паслядоўнай рэалізацыі даследчых праграм мы зможам усё больш дакладна вызначаць становішча "Забароненай рысы". Значна складаней праблема вывучэння здольнасці людзей прыняць гэтыя палажэнні навукі, падпарадкаваць свае дзеянні, сваё жыццё вызначаным канонам. Як зрабіць так, каб чалавецтва прыняло "маральны імператыў"? Каб яно падпарадкавала яму сваё жыццё?» [2, с. 248].

Тут М.М. Майсееў прыходзіць да наступнай высновы – «маральны імператыў», яго прыняцце і выкананне большасцю людзей у сваёй аснове павінна абапірацца на новую сістэму выхавання і навучання. «Чалавецтва, – адзначае навуковец, – падышло да той мяжы, за якой з неабходнасцю павінна ляжаць новая маральнасць, новыя веды, новы менталітэт, новая сістэма каштоўнасцей. Усё гэта павінна абапірацца на веданне таго, што свет – гэта не акаляючае чалавека асяроддзе, а яго адзіны дом, у якім ён толькі і можа жыць. Для таго каб забяспечыць сваю будучыню, чалавек павінен ведаць законы развіцця гэтага дома і ўмець яго ўладкоўваць. Чалавечы Розум і Воля здольны выкарыстаць атрыманыя веды для таго, каб забяспечыць яму магчымасць жыць у гэтым доме».

Па яго меркаванні, выкананне патрабаванняў маральнага імператыву патрабуе і новага мышлення палітыкаў, паколькі ў працэсе наасферагенезу павінны будуць якасна змяніцца і ўзаемаадносіны паміж дзяржавамі. Палітыкам прыйдзецца прызнаць не толькі існаванне забарон на сілавыя спосабы вырашэння наяўных і ўзнікаючых супярэчнасцей, але і прызнаць існаванне агульначалавечых мэт захавання экалагічнай стабільнасці планеты. У сувязі з гэтым перад палітычнай элітай краін сусветнай супольнасці паўстаюць прынцыпова новыя задачы, з якімі палітыкі дрэнна знаёмы і якія яны не яшчэ не навучыліся вырашаць. Засноўваючыся на гэтым, М.М. Майсееў заяўляе аб неабходнасці фарміравання новага аблічча паліталогіі. Ён бачыць у паліталогіі важную складовую экалогіі, звязаную з неабходнасцю вывучэння і стварэння асноў новай цывілізацыі, якая павінна прыйсці на змену грамадству спажывання. Галоўная задача новай палітычнай навукі заключаецца ў тым, каб навучыцца знаходзіць і ўлічваць тыя сілы, кансалідацыя якіх здольна прыпыніць рух да экалагічнай катастрофы. *А для гэтага трэба зразумець, у якой ступені чалавецтва здольна або мае права* мэтанакіравана ўмешвацца ў развіццё сусветнага цывілізацыйнага працэсу.

Фарміраванне новага палітычнага мышлення, па меркаванні М.М. Майсеева, запатрабуе распрацоўкі і новай агульнапланетарнай ідэалогіі. «Я перакананы, што ў цяперашніх умовах надыходзячага агульнапланетарнага крызісу павінна быць выпрацавана некаторая агульнапланетарная ідэалогія, цэментуючая намаганні планетарнай супольнасці, а таксама намаганні, неабходныя для яго выжывання, накіраваныя на пераадоленне наступаючага экалагічнага крызісу» [3, с. 97].

Навуковец лічыць, што хоць тэрмін «ідэалогія» ў дастаткова вялікай ступені дыскрэдытаваў сябе ў XX ст., ні адно грамадства не можа жыць, а тым больш развівацца без ідэалогіі. Па словах М.М. Майсеева, ідэалогія – гэта, у пэўнай ступені, сінтэз маральнасці, светапогляду, ступені прыярытэту грамадскага перад асабістым. Яна з'яўляецца ў некаторай ступені ўсярэдненым вектарам асабістых, эгаістычных памкненняў нацыі, дзяржавы, хоць у вядомых умовах можа быць навязана грамадству і, тым самым, супярэчыць яго аб'ектыўным інтарэсам. Прытрымліванне ідэалогіі, каардынуючай намаганні асобных людзей, больш выгадна нацыі, дзяржаве, чым хаос і дзеянне стыхійных механізмаў самаарганізацыі.

Вучоны падкрэслівае, што не існуе адзінага, а тым больш, па яго словах, «правільнага» светапогляду. Людзі па-рознаму ўяўляюць сабе свет і сваё месца ў свеце, па-рознаму ўяўляюць меру сваёй адказнасці за тое, што адбываецца на планеце, за яе будучыню. Але павінны існаваць некаторыя ўніверсаліі ў паводзінах і поглядах людзей, бо чалавецтва ўзаемадзейнічае з Прыродай як адзіны біялагічны від. Таму, калі М.М. Майсееў гаворыць аб неабходнасці ней-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кай адзінай агульнапланетарнай ідэалогіі, то ён мае на ўвазе нейкую сукупнасць падобных універсалій.

Планетарная ідэалогія, па яго меркаванні, не павінна насіць таталітарны характар або ўяўляць сабой цвёрды рэгламент паводзін, падобны да правілаў шарыяту. Тым больш яна не павінна быць ідэалогіяй сект, якія падаўляюць індывідуальнасць і падпарадкоўваюць чалавека нейкай адназначнай догме або волі іншай асобы. У адрозненне ад камуністычнай ідэалогіі або ідэалогіі рыначнага лібералізму, адзначае М.М. Майсееў, агульнапланетарная ідэалогія, стаўячыся беражліва да асобы індывіда, яго творчасці, павінна пазначаць пэўнае рэчышча калектыўных намаганняў чалавецтва. І гэта рэчышча павінна быць навукова выверaным.

Уся сацыяльна-філасофская канцэпцыя М.М. Майсеева – гэта глыбока абгрунтаваны і дбайна прадуманы праект ператварэння сучаснай цывілізацыі. Ён засноўваецца на палажэнні аб тым, што чалавецтва, абапіраючыся на калектыўны розум з яго здольнасцю фарміраваць агульнае разуменне і прымаць калектыўныя рашэнні, павінна знайсці шляхі да стварэння грамадства, якое забяспечыць яго каэвалюцыю з прыродай і перайсці ў эпоху наасферы.

*Літаратура*

1. *Моисеев, Н.Н.* Универсум. Информация. Общество / Н.Н. Моисеев. – М.: Устойчивый мир, 2001.
2. *Моисеев, Н.Н.* Человек и ноосфера / Н.Н. Моисеев. – М.: Молодая гвардия, 1990.
3. *Моисеев, Н.Н.* Судьба цивилизации. Путь Разума / Н.Н. Моисеев. – М.: МНЭПУ, 1998.

*Summary*

*The author of the article states the conceptual issues of the social and philosophic concept of an eminent scholar of the XX$^{th}$ century Nikita Nikolaevich Moiseev, that refer to the mutual relations of a man and Nature. The consistency of the development of mankind with the development of biosphere when the development of the mankind must not contribute to the degeneration of the biosphere was termed by N.N. Moiseev «coevolution». The article is dedicated to studying the issues of coevolution of the nature and society.*

Паступіў у рэдакцыю 29.09.2010 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ